Мн., 1979; Гурский А. И. Зимняя поэзия белорусов.— Мн., 1980; Петровская Г. А. Белорусские социально-бытовые песни.— Мн., 1982.

*К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік.*

**НАРОДНАЯ ПЕСНЯ**, музычна-паэтычны твор: найбольш пашыраны від вакальнай *народнай музыкі;* песенны фальклор. Н. п.— адзін з найстаражытнейшых відаў музычна-слоўнай творчасці народаў свету. Адлюстроўвае нац. характар народа, звычаі, гіст. падзеі. Адрозніваецца своеасаблівасцю жанравага зместу, муз. мовы, структуры. Існуе пераважна ў вуснай форме, перадаецца дзякуючы выканальніцкім традыцыям і майстэрству таленавітых *народных спевакоў.* Бел. Н. п. вядомы з глыбокай старажытнасці, ахопліваюць некалькі гіст. пластоў. Склаліся на адзінай усх.-слав. глебе і маюць шмат агульнага ў беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Гл. таксама *Этнаграфія музычная.*

**«НАРОДНАЯ СПРАВА»**, газета рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку, орган Бел. сялянска-рабочай грамады (БСРГ). Выдавалася ў Вільні на бел. мове з 19.6 да 27.11.1926. Выходзіла 2 разы на тыдзень. Выдавец П. Мятла. Аналізавала сац. і нац. аспекты палітыкі польск. бурж. ўрада. Адлюстроўвала падзеі нац.-вызв. руху, змагалася за асвету для працоўных, за амністыю для паліт. зняволеных. У рубрыцы «З жыцця «Грамады» інфармавала пра стварэнне новых арг-цый і правядзенне з'ездаў БСРГ, змяшчала інструкцыі Цэнтр. сакратарыята і адозвы мясц. камітэтаў БСРГ. Друкавала вершы М. Васілька, А. Салагуба (Л. Чачоткі), Улад-Ініцкага, А. Мухі, публіцыст. артыкул П. Пестрака, фельетон Я. Маланкі і інш. Апубл. артыкул пра жыццё і дзейнасць Цёткі, яе апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі»; артыкул пра Я. Коласа з нагоды прысваення яму звання нар. паэта Беларусі; адзначыла 20-годдзе выхаду «Нашай долі» і «Нашай нівы». Выйшла 38 нумароў, з іх 7 канфіскавана. З снеж. 1926 БСРГ выдавала газ. *«Наша справа».*

*Літ.:* Говін С. В. Друк Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.).— Мн., 1974 (гл. паказальнік выданняў).

*А. С. Ліс.*

**НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ** мастацкая, народнае мастацтва, мастацкая дзейнасць працоўных; паэзія, музыка, тэатр, танец, архітэктура, дэкар.-прыкладное і выяўл. мастацтва, якія ствараюцца народам і бытуюць у нар. масах; важная частка *мастацкай культуры* чалавецтва. У нар. маст. творчасці знітоўваецца ўсё лепшае, рацыянальнае і каштоўнае, што назапашвалася ў нар. культуры на працягу стагоддзяў. У ёй адлюстроўваюцца прац. дзейнасць, грамадскі і бытавы ўклад жыцця, веданне прыроды, культы і вераванні, этнічныя, рэгіянальныя, сацыяльныя, псіхал. асаблівасці нацыі. Яна ўвасабляе нар. ідэалы, погляды і імкненні, паэт. фантазію, свет думак і пачуццяў, пратэст супраць эксплуатацыі і прыгнёту, мары пра справядлівасць і шчасце. Н. т. вылучаецца глыбінёй маст. асваення рэчаіснасці, праўдзівасцю вобразаў, сілай творчага абагульнення. Багацце вобразаў, тэм, матываў, форм Н. т.— вынік складанага дыялектычнага адзінства індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці, пераемнасці і ўстойлівасці шматвяковых традыцый, адбору, удасканалення і ўзбагачэння вынайдзеных асобнымі майстрамі рашэнняў (гл. *Традыцыі і наватарства*). Высокі маст. ўзровень Н. т. абумоўлены яе сувяззю з карэннымі прынцыпамі нар. светапогляду, паэт. цэласнасцю адносін да свету, пастаянным удасканаленнем майстэрства, перадачай і навучаннем майстэрству. Аснова і традыцыя Н. т.— калектыўнасць, якая праяўляецца ў ходзе ўсяго працэсу фарміравання твораў (звычайна вельмі працяглага ў часе); уключае імправізацыю, яе замацаванне традыцыяй, узбагачэнне, часам абнаўленне традыцыі. Характэрнае для ўсіх відаў Н. т. тое, што стваральнікі твора адначасова з'яўляюцца яго выканаўцамі, а выкананне, у сваю чаргу, можа стаць тым варыянтам, што ўзбагачае традыцыю; важную ролю адыгрывае таксама цесны кантакт выканаўцаў з рэцыпіентамі мастацтва (гледачамі, слухачамі), якія часта могуць выступаць удзельнікамі творчага працэсу. Адметная рыса Н. т.— яе сінкрэтызм, высокамаст. адзінства яе відаў: у нар. абрадавых дзеяннях (гл. *Абрады*) зліваліся паэзія, музыка, танец, тэатр, дэкар. мастацтва; у нар. *жыллі* неаддзельнае цэлае стваралі архітэктура, разьба, размалёўка, кераміка, вышыўка і інш.; нар. паэзія цесна звязана з музыкай. Н. т. розных народаў мае шмат агульных рыс і матываў, якія ўзніклі ў падобных умовах або атрыманы ў спадчыну з агульнай крыніцы. Разам з тым Н. т. на працягу стагоддзяў увабрала асаблівасці нар. жыцця, культуры кожнага народа. Як скарбніца нац. культуры, выразнік нар. самасвядомасці, Н. т. плённа ўплывала і ўплывае на сусветнае прафес. мастацтва, пра што сведчаць творы Ф. Рабле, У. Шэкспіра, А. Пушкіна, М. Някрасава, П. Брэйгеля, Ф. Гоі, М. Глінкі, М. Мусаргскага, Я. Купалы. У сваю чаргу Н. т. шмат успрыняла ад прафесійнага, «высокага» мастацтва, што знайшло адлюстраванне ў многіх яе відах.

Імкненне да вобразнага адлюстравання рэчаіснасці вядома з глыбокай старажытнасці (гл. *Першабытнае мастацтва*). На працягу сац. развіцця чалавецтва, з фарміраваннем класавага грамадства, раздзяленнем працы ад Н. т. адасобілася прафесійнае мастацтва. У дакапіталіст. перыяд развіцця грамадства Н. т. ўсюды вызначалася як калектыўнае традыц. мастацтва працоўных вёскі, а потым і горада. У капіталіст. грамадстве Н. т. развіваецца нераўнамерна: многія яе галіны занепадаюць, знікаюць або знаходзяцца пад пагрозай знікнення; некаторыя трацяць свае лепшыя якасці за кошт прыстасавання да патрэб рынку. У канцы 19—20 ст. узмацняецца ўплыў фальклору на сусв. культуру, аднаўляюцца некат. галіны Н. т., арганізоўваюцца музеі, т-вы аховы Н. т. Разам з тым дзярж. і прыватнае мецэнацтва часта падпарадкоўваюць Н. т. мэтам камерцыі, інтарэсам «індустрыі турызму», дзеля чаго культывуюць у ім найб. архаічныя рысы і патрыярхальныя забабоны.

Сацыяліст. грамадства стварае ўмовы для зберагання, свабоднага і ўсебаковага развіцця Н. т., яе падтрымліваюць дзярж. і грамадскія арг-цыі; майстрам Н. т. прысуджаюцца ганаровыя званні і прэміі. На аснове нац. нар. спадчыны Н. т. пра-

нікаецца ідэямі сацыялізма, пафасам адлюстравання новай, пераўтворанай рэчаіснасці. У СССР створана сетка НДІ, музеяў, якія вывучаюць вопыт Н. т., садзейнічаюць яго пашырэнню і развіццю. Некат. формы Н. т. адміраюць або занепадаюць на пэўны час, інш. набываюць новыя рысы, адпаведныя новаму ладу жыцця, новым матэрыяльным і духоўным запатрабаванням. На аснове традыцыйнай Н. т. развіваецца новая форма маст. культуры — *самадзейнае мастацтва.* Цесна звязаная з прафес. мастацтвам, Н. т. — неадʼемная частка сацыяліст. маст. культуры, важны сродак маст. выхавання, усебаковага і гарманічнага развіцця асобы. Пытаннямі развіцця Н. т. займаюцца рэсп. і абл. навук.-метадычныя цэнтры Н. т. і культ.-асв. работы, раённыя аддзелы і абл. упраўленні культуры пры выканкомах Саветаў нар. дэпутатаў.

На Беларусі здаўна вядомы *народныя гульні-паказы, народная драма* (гл. таксама *Народны тэатр*), у непарыўнай сувязі з прац. дзейнасцю і грамадскім побытам развіваліся *народная музыка, народны танец, народная паэтычная творчасць* (гл. таксама *Этнаграфія музычная*). Важныя формы Н. т. — *народныя мастацкія промыслы, народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, народнае дойлідства.* Носьбіты бел. нар. муз. культуры — *народныя спевакі, народныя музыканты, народныя інструментальныя ансамблі,* вуснай Н. т. — *казачнікі.* На працягу стагоддзяў бел. Н. т. была асн. формай выяўлення маст. мыслення народа, а паасобныя яе віды — і найб. даступнай крыніцай ведаў, кодэксам маральных норм. Узнікшы на агульнай усх.-слав. глебе, Н. т. беларусаў выпрацавала свае адметныя нац. рысы. У той жа час яна мае шмат падабенства з Н. т. рускіх, украінцаў і інш. слав. народаў. Трывалая апора на фальклор, нар. мастацтва — спецыфічная зʼява і сталая вартасць новай бел. л-ры, прафес. музыкі, тэатра і інш. відаў маст. дзейнасці. Яркая і самабытная старонка духоўнай культуры бел. народа — творчасць партызан перыяду Вял. Айч. вайны (гл. *Партызанскі фальклор, Партызанскія песні, Партызанская мастацкая самадзейнасць*). Н. т. Беларусі вывучаюць *Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору* АН БССР, даследчыкі ў музеях, некат. ВНУ. Развіццю розных відаў Н. т. садзейнічаюць абласныя і рэсп. *навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культурна-асветнай работы.* У БССР працуюць *Веткаўскі дзяржаўны музей народнай творчасці, Дзіўнаўскі музей мастацтва і этнаграфіі, Заслаўскі музей рамёстваў і народных промыслаў, Музей народнай творчасці Беларусі, Раўбіцкі музей беларускага народнага мастацтва, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту,* клубы, студыі, гурткі нар. і самадзейнай творчасці; вял. калекцыя твораў нар. майстроў зберагаецца ў *Музеі старажытнабеларускай культуры* ІМЭФ АН БССР. Сістэматычна наладжваюцца выстаўкі, агляды, фестывалі Н. т. Значныя дасягненні ў развіцці Н. т. прадэманстравалі ўсесаюзныя выстаўкі «Слава працы» (1974), «Самадзейныя мастакі — Радзіме» (1977), «Табе, родная партыя, наша творчасць і майстэрства» (1981), «Мір, праца, камунізм» (1982), 1-ы Усесаюзны фестываль самадз. маст. творчасці працоўных (1975—77), Усесаюзны агляд самадз. маст. творчасці, прысвечаны 40-годдзю Перамогі сав. народа ў Вял. Айч. вайне (1984—85). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, Народнае дойлідства, Драўлянае дойлідства, Дываны маляваныя, Куфры размаляваныя, Івянецкая кераміка, Агоўская размалёўка, Самадзейнае музычнае мастацтва, Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва, Самадзейнае тэатральнае мастацтва.*

*Літ.:* Беларуская народная творчасць. [Т.] 1—25. — Мн., 1970—83; Сахута Е. М. Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии. — Мн., 1982; Можейко З. Я. Песни Белорусского Полесья. В. 1—2. — М., 1983—84; Чурко Ю. М. Белорусский народный танец. — Мн., 1972; Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся. XVII—XIX стст. — Мн., 1978. Літ. гл. таксама пры артыкулах *Беларусы, Музычныя інструменты, Этнаграфія музычная.*

*Р. Ф. Шаура.*

**НАРÓДНАЯ ЭТЫМАЛÓГІЯ,** пераасэнсаванне семантычна незразумелых слоў пры дапамозе іх збліжэння са знешне падобнымі (але інш. паходжання) словамі роднай мовы; моўная зʼява. Упершыню тэрмін Н. э. ўвёў Э. Фёрстэман у 1852. Некаторыя мовазнаўцы ўжывалі інш. тэрміны: наіўная (несапраўдная) этымалогія, лексічная (лексічна-семантычная) асіміляцыя, паранімічная атракцыя, этымалагічная рэінтэрпрэтацыя.

Зʼява назіраецца ў мове людзей, якія своеасабліва асэнсоўваюць незразумелыя ім словы і «падпраўляюць» іх пад агульнавядомыя. Такія словы ў сваім развіцці страцілі стараж. этымалагічныя сувязі, якія Н. э. не рэканструюе, а намагаецца тлумачыць іх паходжанне, апіраючыся толькі на выпадковае гукавое падабенства. Напр., «выдра» (роднаснае з літ. ūdra — выдра, ст.-інд. udrás — водная жывёла) звязваецца з «выдраць»; назва будзільніка ў дзіцячай мове як «гудзільнік»; вазеліну як «мазелін». У стараж. часы і ў сярэднія вякі Н. э. давала імпульс для стварэння легенд і міфаў пры тлумачэнні ўласных імён. Напр., імя багіні Афрадыты, запазычанае з семіцкай мовы Aphrēteth (<Aštōreth), кантамінавалася са стараж.-грэч. aphrós (пена) і deato (зʼявілася) і стала азначаць: тая, што зʼявілася з марской пены. На Н. э. пабудаваны шматлікія легенды пра паходжанне бел. рэк і населеных пунктаў. Напр., назва «Гомель» нібыта паходзіць ад слоў «го! мель!», якія крычаў чалавек на беразе р. Сож, папярэджваючы пра мель.

*Літ.:* Откупщиков Ю. В. К истокам слова. — Л., 1968.

*І. І. Лучыц-Федарэц.*

**НАРÓДНІЦТВА** і мастацкая літаратура. Народніцтва — ідэалогія і рух разначыннай інтэлігенцыі на бурж.-дэмакр. этапе вызваленчай барацьбы ў Расіі (1861—95). Заснавальнікі народніцтва — А. І. Герцэн і М. Г. Чарнышэўскі, паслядоўнікі — прадстаўнікі дробнабурж. (разначыннай) інтэлігенцыі, якія на рубяжы 1850—60-х г. прыйшлі на змену дваранскім (шляхецкім) рэвалюцыянерам. Яно яднала ідэі рэв. дэмакратызму з утапічным сацыялізмам, абгрунтоўваючы веру ў магчымасць непасрэднага пераходу да сацыялізма праз сялянскую абшчыну, мінаючы капіталізм. У пач. 20 ст. неанароднікі [эсэры, Бел. сацыяліст. грамада (БСГ)] прызналі наяўнасць у краіне пралетарыяту, але адмаўлялі яго вядучую ролю ў рэв. руху. Раўназначнымі пралетарыяту сац. сіламі яны